**У сярэдняй школе № 2 Зэльвы Гродзенскай вобласці ўжо амаль паўгода як запушчана бізнес-кампанія "Трысняговая папера", у якой удзельнічаюць вучні 9—11 класаў. Праект стаў фіналістам 13-га конкурсу сацыяльных праектаў Social Weekend 2019 года. Грошай на рэалізацыю праекта наша каманда не атрымала, але быў дарэчы прыз — бясплатны хостынг ад Hoster.by, атрыманы на фінале Social Weekend. Гэта таксама стала стымулам не спыняцца, а навучыцца і навучыць новаму сваіх вучняў — стварэнню і распрацоўцы сайта са сваім даменам і хостынгам.**

# Школьны бізнес вачамі настаўніка




Перад запускам бізнес-кампаніі ў мяне былі сумненні ў тым, ці можа сучасны настаўнік даць вучням асновы бізнесу, навучыць іх зарабляць грошы пры мінімальных затратах. Мая спецыяльнасць (настаўнік хіміі і біялогіі) далёкая ад разумення бізнес-плана, маркетынгу, піяру, але за час удзелу ў конкурсе Social Weekend я зразумела, што сучасны свет прымушае вучыцца. Шматлікія лекцыі і трэнінгі ад арганізатараў Social Weekend, навучанне па шведскай праграме EMI-2019 "Далучай. Падтрымлівай. Паляпшай", курс "Сторытэлінг для грамадзянскай супольнасці" — усё гэта за адзін толькі год. Калі запусцілася бізнес-кампанія, усе сумненні адпалі. На кожных занятках я прымяняла ўсе навыкі і ўменні, атрыманыя за год. На першых занятках стварала каманду, прымяняючы метады, атрыманыя па праграме EMI. Сфарміравалася каманда, у якой кожны не толькі праяўляе свае якасці, але і гатовы навучыць іншых.

У нашай школе склалася так, што ў аснову каманды ўваходзяць вучні 9 класа. З самага пачатку іх прыцягвала магчымасць зарабіць грошы ў школе. Час на занятках па суботах праходзіць цікава, весела і ў лёгкай атмасферы. Дзеці вучацца як тэарэтычным асновам бізнесу, так і практычным навыкам. Часам дзеці атрымліваюць і дамашняе заданне. Для гэтага створана гутарка ва "УКантакце". Там дзеці дзеляцца ідэямі, раяцца, дапамагаюць адно аднаму. У канцы кожных заняткаў удзельнікі працэсу бачаць вынікі сваёй працы. Гэта можа быць сабраны на возеры і нарэзаны трыснёг, лісты паперы, што вісяць на сушцы, электронны варыянт дызайнерскіх паштовак з трыснягу ці распрацаваныя рэкламныя лісты, напісаныя і разасланыя пісьмы для зацікаўленых пакупнікоў, продаж тавару, пісьмы-падзякі для актыўных пакупнікоў. Для мяне вельмі важным і нечаканым стала рашэнне вучняў набыць на заробленыя грошы абсталяванне (хаця ў пачатку сваёй дзейнасці дзеці марылі зарабіць для сябе), каб атрымаць магчымасць больш нарыхтоўваць сыравіны і паперы, пашырыць сваю вытворчасць.

У нашай школе працуе крэатыўны малады педагог-псіхолаг Караліна Багдановіч. Яе дызайнерскія ідэі за час удзелу ў конкурсе Social Weekend былі вельмі каштоўныя. Зараз яна займаецца распрацоўкай сайта znova.by. Паназіраўшы за дзецьмі, іх магчымасцямі і схільнасцямі, я бачу, што ў будучыні ёсць каму перадаць гэтую работу. Ідэя выкарыстання трыснягу ў Беларусі для стварэння паперы як упаковачнага матэрыялу — гэта ідэя не адной школы. Таму Караліна Багдановіч заявілася на конкурс БРСМ "100 ідэй для Беларусі", дзе праект стаў пераможцам абласнога этапу і ў лютым будзе ўдзельнічаць у заключным рэспубліканскім этапе ў Мінску. Вельмі радасна было даведацца, што ў якасці падарунка спонсараў пераможцу абласнога этапу праект атрымаў невялікую дапамогу на рэалізацыю. Таксама бізнес-кампанія "Трысняговая папера" як пераможац раённай маладзёжнай бізнес-лабараторыі Profi, што праводзіцца ў рамках праекта "Стварэнне ўстойлівай інфраструктуры для падтрымкі развіцця стартапаў і малога бізнесу ў рэгіёнах Беларусі", які рэалізоўваецца грамадскім аб'яднаннем "Таварыства садзейнічання інавацыйнаму бізнесу" (ТСІБ) пры падтрымцы Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID), атрымала інфармацыйную падтрымку.

У найбліжэйшых планах бізнес-кампаніі — прадумаць дызайн магнітаў і паштовак да Велікоднага кірмашу і Аненскага кірмашу, які праводзіцца штогод у Зэльве і збірае гасцей з усіх куткоў краіны і замежжа, правесці майстар-клас у Нацыянальнай бібліятэцы, музеі кнігі, куды мы запрошаны. Упэўнена, што для нас гэта няндрэнная рэклама.

Як настаўнік хіміі, падчас кампаніі не абыходжуся без эксперымента, дабіваючыся неабходнай якасці паперы. Напрыклад, як упаковачны матэрыял папера павінна быць моцнай, для друку — максімальна гладкай, для дызайнера — экалагічнай і каляровай. Эксперыментуем і з лістамі, якія сабралі на школьным двары. Атрымалі дызайнерскую ўпаковачную паперу для букетаў.

Я вельмі ўдзячна калегам і конкурсу Social Weekend за тое, што



пакладзены пачатак змяненням у прафесіі. Як бы ні было цяжка працаваць у школе ў чаканні змен, заўсёды можна і трэба вучыцца новаму, не ленавацца асвойваць магчымасці інтэрнэту, жыць у нагу з часам.

**Наталля ГРОМ,
настаўніца хіміі сярэдняй школы № 2 Зэльвы Гродзенскай вобласці.**